**Да Года малой радзімы: «Звіваюцца сцежкі-дарогі»**
**Прэзентацыя зборніка вершаў «Звіваюцца сцежкі-дарогі»**
**мясцовай паэткі Ніны Уладзіміраўны Кавальчук**

**Л. Р. Валуевіч,**
бібліятэкар першай катэгорыі
Хатыніцкай СШ Ганцавіцкага раёна

*Чытальнікі чытаюць верш «Вёска мая».*

1.Знаю, дзесці ёсць многа прыгожых краёў незабыўных,
З імі сэрцы людскія заўсёды былі непарыўны.
Для мяне ж няма лепей Хатыніч ваколіц знаёмых,
Я люблю сваю вёску і ўзімку, і ў кветках вясновых.

2.Вёска мая – непаўторны мой край,
Для душы і для сэрца адзіны.
Вёска мая, з табой радасць дзялю і адчай
І ўзлётаў хвіліны.
Вёска мая – летуценняў калыска,
Юначых надзей і жаданняў,
Вёска мая, ты заўсёды, як маці,
Чакаеш сустрэч – не расстанняў.

3.Колькі буду хадзіць па зямлі тваёй любай, жаданай,
Знаю, буду заўсёды сваёй, а не госцяй нязваннай.
Знаю, тут і прывецяць, і скажуць мне добрае слова,
Песняй ў сэрцы жыве твая блізкая, родная мова.

**Вядучы 1.** Дзень добры, паважаныя сябры! Дзень добры, шаноўная Ніна Уладзіміраўна. Сёння мы сабраліся з нагоды выхаду ў друк вашага новага зборніка паэзіі «Звіваюцца сцежкі – дарогі».

**Вядучы 2.** Мы рады вітаць вас на нашай сустрэчы і не выпадкова пачалі размову з верша, у якім вы, Ніна Уладзіміраўна, яшчэ раз нагадваеце нам усім, як важна любіць і берагчы той край, які даў жыццё і адкрыў прыгажосць роднага слова.

**Вядучы 1.** Сапраўдная паэзія ад Бога. Ад Бога прыходзяць на зямлю паэты. У іх заўсёды цярністы шлях, складанае жыццё, але гэтае жыццё – сапраўднае, жывое, няма яму застою.

**Вядучы 2.** І вы ў сваім творы «Вершам - не» пацвярджаеце думку пра тое, што, калі паэзія грунтоўна ўваходзіць у жыццё чалавека, ад яе адказацца цяжка, яна становіцца неабходнасцю.

1.Для сябе зноў вырашыла : «Не!
Вершы я пісаць ужо не буду.
Хіба спраў сур'ёзных у мяне
Больш няма? Вось кіну і забуду».

2.Віравалі думкі ў галаве,
Супраць волі рыфмы ў ёй снавалі.
Адбіралі днём гадзіну – дзве
І заснуць мне ноччу не давалі.

3. Я гадаю: што цяпер рабіць?
Як ваду не выльеш іх пад грушу.
Бо паэткай можна мне не быць,
А вось вершы ўсё ж пісаць я мушу.

**Вядучы 1.** Дарогі… Жыццёвыя пуцявіны… А за шматкроп'ем дарога даўжынёй у 57 гадоў**,** якая пачыналася там, дзе плывуць самыя прыгожыя аблокі, дзе жылі і жывуць самыя спагадлівыя людзі, дзе помніцца ўсё да самай маленькай пясчынкі.

*Верш «Да 55 – гадовага юбілею»*

1.Для сціплай малой дзяўчынкі,
Не зводзячы воч з дарогі,
Маруда ідуць хвілінкі,
І восеньскі дзень стаў доўгі.

2.Па справах паехала мама,
Вярнуцца павінна позна
І купіць гасцінцаў таксама –
малечы чакаць невыносна.

3. …З пяшчотай і ціхім смуткам
Падзеі жыцця ўспамінаю.
Узрост мой зацвіў незабудкай,
Я ўдзячна ўсяму, што маю.
4.Заўжды лічбу «5» любіла,
І вось іх аж дзве – у даце,
Хоць я не чакала – маліла,
Як некалі з горада маці.

5. Даўно ўжо жыццё прабягае
Таропка, галопам, імкліва …
Назад успамінам вяртае,
Жывем вельмі хутка, надзіва.

6.Мільгаюць гады мне хвілінкай,

Звіваюцца сцежкі – дарогі,
Клубок – абярэг павуцінкай
Унукам я кіну пад ногі.

**Вядучы 2.** Распавядаць пра Вас, Ніна Уладзіміраўна, мы пачалі не выпадкова, як і не выпадкова запрасілі Вас, шаноўная, да нас у школу. Пакінуць без увагі гэтую падзею мы не маглі. Чаму б не сказаць удзячнае слова ў адрас рамантычнай, творчай і ўзнёслай натуры, якая ўвесь час імкнулася да адной мэты – выдаць сваю кнігу.

**Вядучы 1.** На працягу многіх гадоў Вы супрацоўнічаеце з рэдакцыяй раённай газеты «Савецкае Палессе». Ці помніцца вам, Ніна Уладіміраўна, калі ўпершыню і які ваш верш з'явіўся на старонках гэтага выдання?
*(«Летуценніца», 1979 быў напісаны, а надрукаваны ў 1981 годзе)*

1. Цёмнай ноччу прыходзіў ты ў сны
З цеплынёй, пяшчотай і ласкай.
Ты прыносіў пачатак вясны,
І жыццёе здавалася казкай.

2.Летуценніцай, мусіць, была,
Бо і ў марах сваіх да світання
Я пад ветразем белым плыла,
Каб сустрэць тваё, любы, каханне.

3.Праляцелі юнацтва гады
І назад не вярнуцца ніколі.
Зноў квітнеюць навокал сады,
Зноў жыты весялеюць на полі.

4.Пахне росна чаромхай з лясоў,
Першы гром над бярозкай грукоча,
І на крылах зялёных вятроў
Адлятае мой смутак дзявочы

**Вядучы 2.** Нам вядома, што ваша першая паэтычная кніжка з рамантычнай назвай «Летуценніца» выдадзена ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Васіля Праскурава. Скажыце, што вы адчувалі у той момант, трымаючы вось гэты невялічкі, але змястоўны зборнік у руках? Хто тады быў побач з вамі, хто вас падтрымліваў у гэты хвалюючы момант?

**Вядучы 1.** Радасна, што паэтычным радкам Ніны Кавальчук знайшлося дастойнае месца на старонках кнігі «Паміж Бобрыкам і Ланню», якая з'яўляецца цудоўнай паэтычнай візітоўкай Ганцаўшчыны. Поруч з імёнамі Міхася Рудкоўскага, Віктара Гардзея, Івана Кірэйчыка,Аляксея Галаскока, Святланы Локтыш пазначана і імя нашай зямлячкі – паэткі Ніны Кавальчук.

**Вядучы 2.** А цяпер, Ніна Уладзіміраўна, нам хацелася б пачуць ад вас, як ствараўся зборнік «Звіваюцца сцежкі - дарогі», якую мэту вы ставілі перад сабою і што адчуваеце сёння.

**Вядучы 1.** Ніна Уладзіміраўна, пачытайце, калі ласка, нам што – небудзь са свайго зборніка, а можа, з таго, што з'явілася пазней і стане пачаткам новай кнігі.

**Вядучы 2.** Вялікі вам дзякуй за падарунак, за вашу кнігу, якую з задавальненнем чытаюць настаўнікі, ужо паспелі пазнаёміцца і вучні нашай школы.

**Вядучы 1.** Да свайго завяршэння падышла наша сустрэча. Вам паважаная, Ніна Уладзіміраўна, хочацца пажадаць моцнага здароўя, спаўнення ўсіх мар і жаданняў, радасці і светлай надзеі. Няхай ваша паэтычная, рамантычная, летуценная душа сакавітым словам, рыфмаваным радком гаворыць аб поспехах, сямейных справах і клопатах, аб тым, што радуе вас і хвалюе.

**Вядучы 2.** Мы ўсе прыхільнікі вашай творчасці чакаем новых вершаў. Каб яшчэ доўгія гады радавалі нас сваёй шчырай , непаўторнай

паэзіяй , каб заўсёды помнілі, не забывалі сваю родную школу, адкуль узяла пачатак у шырокі свет жыцця і ваша творчая сцяжынка.